# Кажура
# Віктар Віктаравіч



**Кажура Віктар Віктаравіч,** нарадзіўся 1 ліпеня 1959 года ў вёсцы Краўчонкі Вілейскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Бацька, Кажура Віктар Аляксандравіч (памёр у 1995 годзе), усё жыццё адпрацаваў у саўгасе "Карпавічы". Маці, Кажура Анастасія Міхайлаўна (памерла ў 2021 годзе), 56 год адпрацавала загадчыцай Карпавіцкага фельчарска-акушэрскага пункта.

У 1966 годзе пайшоў у першы клас Карпавіцкай сярэдняй школы, пасля заканчэння якой, у 1976 годзе, паступіў на філалагічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Максіма Горкага. У 1980 годзе закончыў названую навучальную ўстанову па спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" і атрымаў накіраванне на працу ў Шыпкоўскую васьмігадовую школу Вілейскага раёна, у якой адпрацаваў адзін год. З 1981 па 1983 год займаў пасаду дырэктара Забарскай васьмігадовай школы Вілейскага раёна. Пасля закрыцця Забарскай ВШ (1983 г.) атрымаў новае месца працы ў Карпавіцкай сярэдняй школе Вілейскага раёна, дзе да 1986 года з'яўляўся настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, настаўнікам нямецкай мовы і выхавацелем групы падоўжанага дня.



Жанаты (з 1985 г.), мае дзвюх дачок. Жонка, Кажура Зоя Міхайлаўна, працуе выхавацелем у дзіцячым рэабілітацыйна-аздараўленчым цэнтры "Ждановічы".

У 1986 годзе з сям'ёй пераехаў у г. Вілейку.

Адзін год (з 1986 па 1987) выкладаў беларускую мову і літаратуру ў сярэдняй школе № 3, а з адкрыццём (у 1987 г.) сярэдняй школы № 4 перайшоў у гэту ўстанову (зараз – Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Вілейская гімназія №2"), дзе працуе настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. Мае кваліфікацыйную катэгорыю "настаўнік-метадыст" і вучоную ступень "магістр адукацыі". Член рэдакцыйнай рады часопіса "Роднае слова". Кіраўнік гімназічнай літаратурнай гасцёўні "На Парнасе".

Пісаць пачаў яшчэ вучнем у школе. Першыя вершы былі надрукаваны на старонках Вілейскай раённай газеты "Шлях перамогі" 27 ліпеня 1999 г. З таго часу творы змяшчаліся на старонках раённых,



абласных, рэспубліканскіх і замежных выданняў. На сённяшні дзень выдадзена (асабіста і ў суаўтарстве) 21 кніга (спіс прыкладваецца).

18 верасня 2014 года прыняты ў члены Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Лаўрэат Мінскай абласной прэміі ў галіне літаратуры ў намінацыі “Дзіцячая і падлеткавая літаратура” (2016 г. – за кнігу “Азбукоўнік”). Узнагароджаны Граматамі Мінскага абласнога аддзялення СПБ, ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі” (2022 г.). Член рады Мінскага абласнога аддзялення СПБ.

Пераможца конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў “Настаўнік года Вілейскага раёна – 2017”.

Тройчы (у 2008, 2014 і 2021 гадах) прызнаваўся пераможцам індывідуальнага спаборніцтва сярод працаўнікоў народнай гаспадаркі раёна за званне “Лепшы па прафесіі” ў намінацыі “Лепшы працаўнік установы адукацыі”.

Працоўныя дасягненні адзначаны шматлікімі граматамі і дыпломамі Вілейскага раённага ўпраўлення па адукацыі, спорце і турызме, Галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2017 г.) і Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2023 г.)

У 2008 годзе стаў лаўрэатам прэміі Спецыяльнага фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за асобы ўклад у развіццё здольнасцей адораных вучняў і студэнтаў.

Прэзентацыя кніг адбывалася на Беларускім радыё і тэлебачанні, на XXIII, XXIV, XXV, XXVI, XXVII XXVIII, XXIX, XXX Мінскай Міжнарожнай кніжнай выставе-кірмашы, на Бялградскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы (Сербія, 2017 г.).

# СПІС КНІГ ВІКТАРА КАЖУРЫ

Віктар Кажура, Бажэна Мацюк, Дзмітрый Андрыеўскі. Сабе і людзям. – Мінск: МАІРА, 2009.

Віктар Кажура, Бажэна Мацюк. Гэта ўсё – Радзіма наша. – Мінск: беларус. асац. “Конкурс”, 2013.

Віктар Кажура. Азбука ў вершах і малюнках. – Мінск: “Пачатковая школа”, 2014.

Віктар Кажура. Паэтычныя забавы: вершы-загадкі. – Мінск: выдавецкі дом “Звязда”, 2015.

Віктар Кажура. Азбукоўнік: пазнавальна-навуковая, часам гульнёвая, кніжка-чытанка, камусьці забаўлянка. – Мінск: беларус. асац. “Конкурс”, 2015.

Віктар Кажура. І загучала слова. – Мінск: беларус. асац. “Конкурс”, 2016.

Віктар Кажура, Ангеліна Прохарава. Хто схаваўся пад лісток. – Мінск: “Колорград”, 2017.

Віктар Кажура, Зоя Кажура. Рэха мінулых дзён. – Мінск: беларус. асац. “Конкурс”, 2018.

Віктар Кажура. Азбука ў вершах і малюнках. – Мінск: “Пачатковая школа”, 2-е выданне, 2018.

Виктор Кажуро. Песничке игре: загонетке, песмице и успаванке за децу (на сербскай мове). – Београд: КИЗ “Центар”, 2018.

Віктар Кажура. Маленькая азбука вялікай краіны. – Мінск: “Пачатковая школа”, 2019.

Віктар Кажура. Пакацілася сонейка… Вершы і загадкі пра месяцы года. – Мінск: “Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі”, 2020.

Віктар Кажура. Азбука ў загадках. – Мінск: “Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі”, 2020.

Віктар Кажура. Слоўца да слоўца: амонімы для пачатковай школы. – Мінск: “Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі”, 2020.

Віктар Кажура. Беларускія прыказкі ў вершах. – Мінск: “Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі”, 2021.

Віктар Кажура. Патрэбныя рэчы заўсёды дарэчы: Загадкі. – Мінск: “Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі”, 2020.

Віктар Кажура. Скажы так, каб я зразумеў. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БА “Конкурс”, 2022.

Віктар Кажура. З легендаў і міфаў: Героі беларускай міфалогіі. – Мінск: “Народная асвета”, 2022.

Віктар Кажура. З легендаў і казак: Маленькая энцыклапедыя беларускай міфалогіі. – Мінск: “Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі”, 2022.

Віктар Кажура. Энцыклапедыя юнага натураліста. – Мінск: “Народная асвета”, 2022.

Віктар Кажура. Дзівы розныя на свеце…: загадкі. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БА “Конкурс”, 2023.